“Лета з добрай кнігай”

На Кобрыншчыне каля 50 дзіцячых аздараўленчых лагераў рознага тыпу ўжо правялі шмат цікавых мерапрыемстваў, прысвечаных кнізе. Актыўна праводзяцца разнастайныя сустрэчы дзяцей і кніг у гарадскіх і сельскіх бібліятэках. На- прыклад, у чэрвені ладзілася актыўная работа з выхаванцамі лагераў школ горада і дзіцячых садкоў.

Цікавую праграму для дзяцей падрыхтавала ***дзіцячая бібліятэка гора да Кобрына***. У межах акцыі праводзіліся кон-курс дзіцячага чытання "Летам з кнігай я сяброю", конкурсна-гульнявая праграма "Свята дзяцінства, свята сонца", інфар- мацыйны агляд "Лёгкі часопісны круіз", таксама ладзіліся прэзентацыя кніжнай выставы, прысвечаная 70-годдзю вызва- лення Рэспублікі Бела-русь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і іншыя мерапрыемствы.



Антураж старажытнай кнігі выклікаў інтарэс выхаванцаў аздараўленчай змены лагера "Гуртковец" ДУА "Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці". Гартаючы старонкі гісторыі, дзеці не раз звярталіся за карыснай парадай да кнігі ў незвы- чайнай вокладцы.

А ў СШ № 8 дзеці актыўна ўдзельнічаюць у акцыі "Летняе чытанне з захапленнем". Аб прачытаных кнігах яны пакіда- юць свае водгукі, па вы- ніках будуць вызначаны лепшыя чытачы.

Наведвальнікаў Дзівінскай дзіцячай бібліятэкі зацікавіла "Чы-танне пад летнім парасонам". Незвычайная акцыя сабрала дзяцей не ў цішыні бібліятэчных паліц, а паклікала разам з кнігамі і часопісамі на свежае паветра. Акрамя гэтага, юныя дзівінчане актыўна прыводзяць у бібліятэку сваіх сяброў, што прыехалі ў вёску на канікулы, рамантуюць кнігі.

Выстава кніг старога выдання пад назвай "Даўно забытае мінулае" была арганізавана ў бібліятэцы Навасёлкаўскай школы.

На працягу лета дзя-цей чакае яшчэ шмат раз- настайных мерапрыемстваў, а заключны этап акцыі пройдзе 7 верасня ў горадзе Заслаўе ў Дзень беларускай пісьменнасці.

Так называецца акцыя, якая праводзіцца з І чэрвеня па 7 верасня па ініцыятыве Міністэр- ства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Мэта акцыі - узмацніць выхаваўчую ролю і значэнне кнігі ў час летніх канікулаў.

Ірына ЛЕСІК.